# ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

## НОВЫ ГОД – ЧАС ПАДАРУНКАЎ, ЗДЗЯЙСНЕННЯ ЖАДАННЯЎ І САПРАЎДНАГА ЧАРАЎНІЦТВА






### СВЯТКАВАННЕ НОВАГА ГОДА Ў ШКОЛЕ

Адзначаць навагоднюю свята разам са школьнымі сябрамі, аднакласнікамі – гэта ўсё ўжо ўвайшло ў традыцыю нашай школы. Цудоўныя казкі, усмешкі, бляск у вачах і масу незабыўных эмоцый і пазітыву падарылі навучэнцы адзін аднаму ў гэты дзень!

### НАВІНЫ ДЗІЦЯЧАГА САДА

**Акцыя "Пакарміце птушак зімой"**

### АБЛАСНЫ ІНКЛЮЗІЎНЫ ФЕСТЫВАЛЬ "ЗАПАЛІ СВАЮ ЗОРКУ"

15 снежня горад Дзяржынск прымаў гасцей з усяго раёна. На свята былі запрошаны дзеці з асаблівасцямі развіцця. У гэты дзень на сцэне сапраўды запаліліся новыя зоркі.



### АДЗІНЫ ЎРОК, ПРЫСВЕЧАНЫ ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ

Ва ўсіх установах агульнай сярэдняй адукацыі 20 снежня быў праведзены адзіны ўрок, прысвечаны заступніцы зямлі беларускай Ефрасінні Полацкай.

**Асветніцы зямлі беларускай…**
Беларусь, твая дачка я.
Зярнятка я, а ты — мая ралля.
**В. Іпатава.**



*У ГЭТЫМ ВЫПУСКУ*


АКЦЫЯ "ТРЫ ДЗЯСЯТКІ ДОБРЫХ СПРАЎ"

НОВЫ ГОД 2024

ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ




Газета выдаецца з кастрычніка 2001 г. / Тыраж: 10 экзэмпляраў

ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

# Тры дзясяткі добрых спраў

**ЛЕАНЕЦ АНАСТАСІЯ,**

**8 КЛАС**



9 снежня сярод вучняў 5-9 класаў прайшоў працоўны дэсант, прысвечаны Міжнароднаму дню памяці ахвяр злачынстваў генацыду.

Удзельнікі акцыі зрабілі ачыстку тэрыторыі ад снегу помніка воінам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

На беларускай зямлі, скатаванай кровапралітнымі, працяглымі і шматлікімі войнамі, вялікая колькасць воінскіх пахаванняў з часоў Вялікай Айчыннай вайны. Нашым святым абавязкам з'яўляецца шанаваць памяць загінуўшых герояў і аберагаць іх вечны спакой.







# Абласны інклюзіўны фестываль "Запалі сваю зорку"

**САВЕНОК ГАННА,**

**8 КЛАС**

15 снежня ў Дзяржынску сабраліся 350 дзяцей, якія прыехалі з усіх раёнаў вобласці і горада Жодзіна. На плошчы перад Домам культуры іх чакала шмат інтэрактыўных гульняў і забаў, якія забяспечылі ўдзельнікам свята добры настрой на ўвесь дзень.

У працяг урачыстасці была арганізавана выстава вырабаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці ўдзельнікаў фестывалю.

**Ад нашай установы адукацыі з музычным нумарам выступала Неўдах Ульяна.**

У гэты дзень на сцэне сапраўды запаліліся новыя зоркі.








01.01.2023 / / ПАНЯДЗЕЛАК / / 4 ВЫПУСК

ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

# ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ – АСВЕТНІЦА ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

ГРЫКЕНЬ АЛЕНА, БУЛОЙЧЫК ВІКТОРЫЯ

8 КЛАС



Сёння немагчыма кожнаму з нас перааацаніць уклад Ефрасінні Полацкай у багатую спадчыну беларускага народа. І ёсць чаму павучыцца ў Ефрасінні.

У мэтах духоўна-маральнага і патрыятычнага выхавання вучняў ва ўсіх установах агульнай сярэдняй адукацыі 20 снежня быў праведзены адзіны ўрок, прысвечаны заступніцы зямлі беларускай Ефрасінні Полацкай.




На мерапрыемстве абмеркавалі пытанні духоўнай спадчыны і асветніцкай дзейнасці беларускай асветніцы. З яе імем звязана адкрыццё першых адукацыйных устаноў і бібліятэк, стварэнне школы архітэктуры і жывапісу, развіццё рамёстваў. Прападобная Ефрасіння на працягу ўсяго свайго жыцця пасля сыходу ў манастыр была мудрай ігуменняй, настаўніцай жанчын у таінствах духоўнага жыцця. Асветніцкая дзейнасць Ефрасінні Полацкай мела вялікае значэнне для грамадскага і дзяржаўнага жыцця Полацкага княства.









## *НЯХАЙ НОВЫ ГОД САГРЭЕ КОЖНАГА СВАІМ ЧАРАЎНІЦТВАМ, ПАДОРЫЦЬ НАДЗЕЮ НА ЛЕПШАЕ І ЗДЗЕЙСНІЦЬ САМЫЯ ПАТАЕМНЫЯ ЖАДАННІ!*

**ПАСКАНЮК ЯНА,**

**9 КЛАС**

Новы год – гэта самае чароўнае, вясёлае свята, якое чакае кожны з нас.

27 і 29 снежня ў нашай установе адукацыі прайшлі навагоднія ранішнікі “Навагодняе падарожжа”, “Прыгоды ў навагодняй ялінкі”. Упрыгожаная зала, прыбраная ялінка, падарункі надалі асаблівую святочную атмасферу. Дзед Мароз і Снягурка, Снегавік – персанажы нашага свята, якія парадавалі гасцей ранішніка. Рабяты пагрузіліся ў свет цудаў, прыгод, чараўніцтва, неверагодныхператварэнняў і сюрпрызаў. Дзеці танцавалі, спявалі песні, чыталі вершы, вадзілі карагоды, з задавальненнем удзельнічалі ў гульнях і конкурсах. Выхаванцы атрымалі масу станоўчых эмоцый і доўгачаканыя падарункі.

*Адзначаць навагоднее свята разам са школьнымі сябрамі, аднакласнікамі – гэта ўсё ўжо ўвайшло ў традыцыю нашай школы.*




*Цудоўныя казкі, усмешкі, бляск у вачах і масу незабыўных эмоцый і пазітыву падарылі навучэнцы адзін аднаму ў гэты дзень!*




27 снежня атрымалі порцыю добрага настрою і пазітыву ад музыкі, танцаў, вясёлых конкурсаў і гульняў навучэнцы 5-9 класаў, якія прыйшлі на навагодні канцэрт “Чароўны гадзіннік”. Дзеці з вялікай радасцю сустрэлі самых доўгачаканых гасцей на сваце – Дзеда Мароза і Снягурку, і былі не толькі гледачамі, але і ўдзельнікамі свята: прадстаўлялі нумары мастацкай самадзейнасці, удзельнічалі ў музычных конкурсах, выконвалі навагоднія песні, танцавалі пад усім знаёмыя трэкі. А гледачы з задавальненнем удзельнічалі ў конкурсах і падпявалі артыстам. Гадзіна праляцела як адно імгненне.

Вось так наш дружны школьны калектыў сустрэў Новы 2024 год. Няхай ён прынясе шчасце ў кожны дом.









ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»



## АКЦЫЯ “ПАКАРМІЦЕ ПТУШАК ЗІМОЙ”

***Паважаныя чытачы, звярніце ўвагу на птушак зімой!***

**НЕЎДАХ САФІЯ, 5 КЛАС**

**Снегіры**

*Як агеньчыкі, ў двары*
*Скачуць, скачуць снегіры.*
*Запытала ў брата Таня:*
*— Можа, снег ад іх растане?*

**П. Пранузa**

## Жавіны дзіцячага сада!

Акцыя накіравана на фарміраванне беражлівых адносін да прыроды, актывізацыю творчай, пазнавальнай, прыродаахоўнай ініцыятывы вучняў.

Зіма – самы цяжкі час для зімуючых птушак. Даступнай ежы становіцца значна менш, а патрэба ў ёй узрастае. Часам натуральны корм практычна недаступны, таму многія птушкі могуць не перажыць зіму і загінуць. Аднак, калі птушка сыта, ёй не страшныя моцныя маразы.



З надыходам халадоў у пошуках корму сініцы, снегіры, вераб'і і многія іншыя птушкі пачынаюць шукаць корм паблізу жылых дамоў. Таму людзі прыходзяць птушкам на дапамогу: вырабляюць кармушкі і напаўняюць іх рэгулярна кормам.

Нашы выхаванцы дзіцячага садка далучыліся да гэтай акцыі. Па традыцыі рабяты развесілі кармушкі для птушак і напоўнілі іх рознай ежай.



ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

***ВЫКАНАННЕ ПРАВІЛ БЯСПЕКІ ДАЗВОЛІЦЬ АТРЫМАЦЬ ТОЛЬКІ СТАНОЎЧЫЯ ЭМОЦЫІ АД СВЯТОЧНЫХ ДЗЁН***

# ПРАВІЛЫ БЯСПЕЧНЫХ ПАВОДЗІН ПАДЧАС НАВАГОДНІХ СВЯТ

1. Не ўпрыгожвайце ялінку цацкамі з тканіны і пластмасы

2. Не абкладвайце падстаўку ялінкі ватай..

3. Асвятляць ёлку варта толькі электрагірляндамі прамысловай вытворчасці

4. У памяшканні не дазваляецца запальваць бенгальскія агні, ужываць хлапушкі і васковыя свечкі. *Памятаеце, адкрыты агонь заўсёды небяспечны!*

5. Не варта выкарыстоўваць піратэхніку, калі вы не разумееце як ёю карыстацца, а інструкцыі не прыкладаецца, ці яна напісана на незразумелай вам мове.

